# Працяжнік паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах
# Урок беларускай мовы ў 9 класе

**Н. Я. Бурко,**
настаўнік беларускай мовы і літатаратуры
першай катэгорыі
базавай школы № 3 г. Полацка

**Мэты:**

❒ *адукацыйная:* стварыць умовы для замацавання ведаў аб правілах пастаноўкі працяжніка паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах; садзейнічаць выпрацоўцы ўменняў правільна пунктуацыйна афармляць бяззлучнікавыя складаныя сказы, інтанаваць іх; спрыяць удасканаленню ўменняў вызначаць межы прэдыкатыўных частак, будаваць бяззлучнікавыя складаныя сказы з простых, заўважаць і выпраўляць памылкі ў пастаноўцы знакаў прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах;

❒ *развіваючая:* спрыяць развіццю ўменняў працаваць у парах, групах і самастойна; спрыяць развіццю ўмення знаходзіць і выпраўляць памылкі ў чужым і ўласным пісьмовым выказванні, ацэньваць сваю працу на ўроку; садзейнічаць развіццю маўлення вучняў; дапамагчы вучням у фарміраванні чуйнасці да роднай мовы;

❒ *выхаваўчая:* спрыяць выхаванню ў дзевяцікласнікаў цікавасці да народнай і літаратурнай спадчыны беларусаў.

**Тып урока:** урок замацавання ведаў, уменняў і навыкаў.

**Абсталяванне**: запісы на дошцы, індывідуальныя лісты з заданнямі.

**Эпіграфы**

1. Не спяшы языком – паспяшай справай. *(Прыказка)*
2. Розум будзе – прыйдзе шчасце. *(Прыказка)*
3. З разумным павядзешся – розуму набярэшся, з дурнем – свой страціш. *(Прыказка)*
4. Лёгкі здабытак – лёгкі пражытак. *(Прыказка)*
5. Ад навукі спрытнеюць розум і рукі. *(Прыказка)*

## Ход урока

### I. Арганізацыйны момант

*Стварэнне станоўчай эмацыянальнай атмасферы на ўроку: настаўнік вітаецца з вучнямі, жадае поспехаў у працы, просіць усміхнуцца адзін аднаму і сесці за парты.*

### II. Паведамленне тэмы ўрока і яго мэты

1. Настаўнік агучвае тэму ўрока, адзначаючы, што гэта другі ўрок у сістэме ўрокаў па вывучэнні правілаў пастаноўкі працяжніка паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах.

2. Настаўнік паведамляе тэму ўрока.

3. Настаўнік прапануе вучням самім акрэсліць задачы для ўрока. Вызначэнне задач праходзіць у выглядзе гульні «Так ці не».

1) Нам неабходна замацаваць веды аб правілах пастаноўкі працяжніка паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах *(так).*

2) Неабходна вучыцца правільна пунктуацыйна афармляць бяззлучнікавыя складаныя сказы, іх інтанаваць *(так).*

3) Неабходна замацаваць веды аб правілах пастаноўкі кропкі з коскай паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах *(не).*

4) Неабходна ўмець выконваць разнастайныя практыкаванні ў межах прапанаванай тэмы *(так).*

5) Неабходна паспяхова выканаць тэставае заданне ў канцы ўрока *(так).*

6) Неабходна атрымаць добрую адзнаку за працу на ўроку *(так).*

4. Праца з эпіграфамі *(настаўнік звяртае ўвагу дзевяцікласнікаў на эпіграфы, паведамляе, што кожны вучань у працэсе ўрочнай дзейнасці павінен выбраць для сябе прыказкі, змест якіх адпавядаў іх працы на ўроку).*

**III. Праверка дамашняга задання**

1. Праверка ведання тэарэтычнага матэрыялу. Лінгвістычнае паведамленне вучняў па тэме «Правілы пастаноўкі працяжніка паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах» *(2–3 вучні).*

2. Праверка пісьмовага дамашняга задання *(робіцца выбарачная праверка).*

**IV. Праца па тэме ўрока**

Вучням прапануюцца лісты з заданнямі.

**1. Суаднясіце бяззлучнікавыя складаныя сказы з сэнсавымі адносінамі, што ўзнікаюць паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах** *(праца ў парах)***.**

1) Цягнік нячутна крануўся – пабегла назад прывакзальная плошча. 2) Адны днямі корпаюцца на градах, другія бегаюць у бліжэйшы лясок у грыбы, некаторыя проста вылежваюць у гамаку – звычайнае лета ў дачным пасёлку. 3) Умееш быць сябрам – людзі ўмеюць гарнуцца да цябе. 4) Віця пашпацыраваў па тратуарах, пахадзіў па парку – весялей не стала. 5) Засмяялася – званочак зазвінеў. 6) Хай пойдзе суткі цёплы дождж – папараць зазелянее і дагоніць малады сасняк.

**Адносіны:** *а) супрацьпастаўлення; б) умовы, часу; в) хуткая змена падзей або вынік; г) абагульненне папярэдніх частак; д) параўнанне.*

*Д а в е д к а: 1) – в); 2) – г); 3) – б); 4) – а); 5) – д); 6) – б).*

**2. Дыферэнцыраваная праца**

**Варыянт 1. Запішыце (прачытайце) сказы, на месцы пропускаў пастаўце знакі прыпынку. Растлумачце іх пастаноўку** *(вучні працуюць пад кіраўніцтвам настаўніка)***.**

1. Будзільнік зазвінеў_Дзімка расплюшчыў вочы, аднак уставаць не спяшаўся. 2. Рыгор успомніў_з Раманам яны пазнаёміліся на гастролях у Маскве. 3. Гультай за работу_мазоль за руку. 4. Няма народаў малых_бываюць малыя паэты. 5. Пахнуць па-хатняму грады_сакочуць конікі_стаіць жніўны месяц.

**Варыянт 2. Прачытайце сказы. Выпраўце памылкі (дзе трэба) у пастаноўцы знакаў прыпынку паміж часткамі бяззлучнікавых складаных сказаў. Запішыце выпраўленыя сказы. Праверце сябе па эталоне** *(вучні працуюць кожны самастойна)***.**

1. Ступіш на ганак: пад нагамі ўгнуцца і зарыпяць старыя дошкі. 2. Побач з пшаніцай пасеялі лён, побач з рабінай красуецца клён. 3. Мы ўдваіх паспрабавалі ламаць дзверы; нічога не выходзіла. 4. Закаханых packседзець было нельга – яны не развіталіся да світання. 5. Сонца падымалася вышэй – пад яго промнямі выпаралася раса.

Эталон

1. Ступіш на ганак – пад нагамі ўгнуцца і зарыпяць старыя дошкі. 2. Побач з пшаніцай пасеялі лён, побач з рабінай красуецца клён. 3. Мы ўдваіх паспрабавалі ламаць дзверы – нічогане выходзіла. 4. Закаханых пераседзець было нельга: яны не развіталіся да світання. 5. Сонца падымалася вышэй – пад яго промнямі выпаралася раса.

**Варыянт 3. Перабудуйце простыя сказы ў бяззлучнікавыя. Расстаўце знакі прыпынку** *(вучні працуюць у групе)***.**

1. Вецер суняўся. Завея скончылася. У цёмным небе з’явіўся месяц. 2. Па лесе імчаўся гул. Пачалася навальніца. 3. Закончыўся рабочы дзень. Усе заспяшаліся дадому. 4. Света прыслухалася. Чуваць гуллівая песня шпака каля новай шпакоўні.

**Хвілінка адпачынку**

**1.** Вучні разам з настаўнікам выконваюць зарадку для вачэй.

**2.** Вучням прапануецца адгадаць загадкі, што маюць будову бяззлучнікавых складаных сказаў.

1. Пакаціўся клубок, рассыпаўся гарох, пачало світаць – не было чаго збіраць. *(Месяц і зоркі на небе.)*

2. Круглы, як сонца, шыпіць пад ім донца. Падрумяніцца бачок – скоціцца пад ручнічок. *(Бліны, аладкі.)*

3. Адзін лье, другі п’е, трэці расце. *(Дождж, зямля, трава.)*

4. Тоўсты тонкага паб’е – тонкі што-небудзь прыб’е. *(Малаток і цвік.)*

**3. Графічны дыктант**

Настаўнік чытае бяззлучнікавыя складаныя сказы, а вучні прастаўляюць у сшытках толькі знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах. *Адзін вучань выконвае заданне на дошцы, а потым, пасля праверкі настаўнікам, вучні робяць самаправерку ў сваіх сшытках.*

1) Кончыўся дождж – усе зноў узяліся за працу **(–)**.

2) Калыхаліся палахлівыя чароты, пагойдваліся стройныя сітнякі, лес шапацеў лісточкамі – усё гэта злівалася ў прыгожую музыку **(, , –)**.

3) Тут спрадвеку павялося: жаданых гасцей сустракалі хлебам-соллю **(:)**.

4) Густа зацвіў чабор на пясчаных узгорках, трава на заліўных лугах паднялася ў пояс **(,)**.

**4. Тэставае заданне**

**1) Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць працяжнік:**

а) Алесь зразумеў … нервовасць Кастуся можа сапрсаваць справу.

б) Вецер загуляе … хвойнік, лозы гнуцца.

в) Не туман на рацэ плыве … прыдрамалі ў цясніне аблокі.

г) Любіце працу … у ёй найбольшы смак жыцця.

**2) Адзначце схему, якая адпавядае сказу. Знакі прыпынку не пастаўлены:**

Кранеш галінку … мокрая гронка язміну асыпаецца пялёсткавым дажджом.

а) [ ], [ ].

б) [ ]: [ прычына].

в) [ ] – [час, умова ].

г) [ ] – [вынік, вывад ].

*А д к а з ы: 1) б), в); 2) г).*

**V. Падвядзенне вынікаў урока**

**1.** Спачатку вучні даюць ацэнку сваёй працы на ўроку, вызначаюць, ці выкананы задачы, прагназуюць вынікі выканання тэставага задання, а затым настаўнік робіць свае заўвагі, паведамляе, што выніковая адзнака будзе выстаўлена пасля праверкі тэстаў.

**2.** Вучні (па жаданні) агучваюць прыказкі, якія яны выбралі для сябе, тлумачаць іх сэнс і знакі прыпынку.

**VI. Рэфлексія**

Калектыўнае чытанне верша Людмілы Кебіч «Маладому Беларусу»:

Малады чалавек!

Што нясе табе век?
Што дасі яму ты менавіта?
Разбурэнне і жах
У дзіцячых вачах,
Родны край, ціхім жалем спавіты?

Малады мой Сакол!
Азірніся вакол –
Адчуваеш, твой час наступае.
Беларускі Ікар,
Гэты сіні абшар
Тваё мужнае сэрца чакае.

Беларус малады!
Зазірні праз гады –
Можа, хопіць нам кпінаў і здзекаў?!
Успрымі як прымус –
Тут твая Беларусь,
Кроч адважна, як крочыў спрадвеку.

**VII. Дамашняе заданне**

1. Паўтарыць тэарэтычны матэрыял па памятках.
2. Практыкаванні 143, 147 (на выбар).

**Літаратура**

1. **Беларуская мова:** вучэбны дапаможнік для 9-га класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання / Н. М. Гардзей [і інш.]; пад рэд. Н. М. Гардзей. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011. – 264 с.

2. **Зборнік беларускага фальклору**: з гукавым электронным дадаткам. – Мінск: Выш. шк., 2010. – 254 с.

3. **Краіну родную люблю**: зборнік паэзіі: для ст. шк. узр. / уклад. М. Мінзер. – Мінск: Літ. і маст., 2010. – 280 с.

4. **Цыбульская, С. І.** Беларуская мова: 9-ы клас: рабочы сшытак: практыкаванні для павышэння пісьменнасці і паспяховасці / С. І. Цыбульская. – Мінск: Сэр-Віт, 2017. – 144 с.